Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі
«Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі»

# Сядзібы і паркі Докшыцкага раёна

*Праект краязнаўчага маршрута № 2*

Укладальнік – педагог дадатковай адукацыі Вайцяховіч А.В., кіраўнік аб’яднання па інтарэсах “Турызм”

# *Сядзібы і паркі Докшыцкага раёна*

***Праект краязнаўчага маршрута***

Турыстычны паход II ступені складанасці “Сядзібы і паркі Докшыцкага раёна” ставіць перад сабой мэту: даследаванне рэгіянальных гістарычна-культурных і прыродных каштоўнасцей роднага краю, захаванне каштоўнай спадчыны Докшыцкага раёна. Ён разлічаны на дзяцей сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту.

Адпраўным пунктам падарожжа з’яўляецца горад Докшыцы. Аднак вучні з сельскай мясцовасці могуць пачаць паход з бліжэйшага да іх школы пункта маршрута.

У час падарожжа турысты пройдуць праз 5 вёсак, дзе захаваліся рэшткі былых панскіх маёнткаў. Пазнаёмяцца з гісторыяй велічных культавых збудаванняў у вёсках Сітцы і Параф’янава. Удзельнікі пахода могуць арганізаваць у гэтых мясцінах працоўны і экалагічны дэсант. Перад групай можна паставіць задачу: сабраць больш матэрыялаў аб гісторыі сядзібава-паркавых комплексаў, аб іх уладальніках і будаўніках. Для гэтага можна арганізаваць сустрэчы з мясцовымі жыхарамі.

Паход можна ажыццявіць як у летнія месяцы, так і на працягу ўсяго навучальнага года. Для гэтага прадугледжаны два варыянты начлегу.

Функцыі экскурсавода або гіда можа выконваць не толькі кіраўнік групы, але і самі ўдзельнікі пахода. Для гэтага кіраўнік перад пачаткам падарожжа можа пазнаёміць вучняў з матэрыяламі дадзенага метадычнага дапаможніка або рэкамендаваць для знаёмства матэрыялы з другіх крыніц.

# Тлумачальная запіска

Адным з асноўных накірункаў работы па рэалізацыі дзяржаўнай экалагічнай палітыкі з'яўляецца павышэнне экалагічнай культуры насельніцтва. Для дасягнення гэтай мэты лічыцца абавязковым выкладанне адпаведных дысцыплін ва ўсіх сферах адукацыі і выхавання.

Аднак у цяперашні час пры шматвобразнасці накопленых форм і метадаў сістэма экалагічнай адукацыі і выхавання з'яўляецца недасканалай. Развіццё экалагічнай адукацыі і выхавання стрымліваецца спажывецкімі адносінамі да прыроды, недастатковым узроўнем экалагічнай граматнасці, недахопам вучэбна-метадычнага і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння.

Праект эколага-краязнаўчага маршрута “Сядзібава-паркавыя ансамблі Докшыччыны” складаўся з мэтай паказаць вопыт сумеснай работы педагогаў Дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі “Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі” і навучэнцаў, раскрыць некаторыя асаблівасці вучэбна-выхаваўчага працэсу ўстановы адукацыі па эколага-біялагічнаму і турысцка-краязнаўчаму профілям.

Азнаямленне з мастацкай спадчынай старых сядзіб і паркаў дае магчымасць убачыць цэлы рад цікавых тэхнічных і мастацкіх прыёмаў, вывучыць, а значыць, і зберагчы іх для паспяховага развіцця сучаснага паркавага будаўніцтва.

Прапанаваны эколога-краязнаўчы маршрут складаецца з дзвюх частак. Першая частка разлічана на завочнае вывучэнне сядзіб і пейзажных паркаў нашага краю. Тут удзельнікі турысцка-краязнаўчых і эколага-біялагічных аб'яднанняў па інтарэсах у камеральных умовах змогуць пазнаёміцца з гісторыяй развіцця сядзібава-паркавых комплексаў Докшыччыны, з біяграфіяй іх будаўнікоў і ўладароў. Для лепшага засвойвання матэрыялу гэта частка ўтрымлівае заданні рознай ступені складанасці.

Другая частка разлічана на практычнае знаёмства. Яна ўтрымлівае метадычныя рэкамендацыі па правядзенню экскурсіі, або падарожжа па месцах, дзе знаходзяцца рэшткі былых панскіх маёнткаў і пейзажных паркаў. Удзельнікі экскурсіі могуць арганізаваць у гэтых мясцінах працоўны і экалагічны дэсанты. Перад групай можна паставіць задачу: сабраць больш матэрыялаў аб гістрыі сядзібава-паркавых комплексаў, аб іх уладальніках і будаўніках. Для гэтага можна арганізаваць сустрэчы з мясцовымі жыхарамі.

Праект эколага-краязнаўчага маршрута разлічаны на вучняў сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту і будзе карысны для настаўнікаў школ, педагогаў дадатковай адукацыі турысцка-краязнаўчага і эколага-біялагічнага профіляў і намеснікаў дырэктароў па выхаваўчай рабоце.

# Сядзібава-паркавыя ансамблі Докшыччыны

(Тэарэтычная частка)

**Мэта:** Знаёмства з гістарычнымі і прыроднымі асаблівасцямі сядзібава-паркавых ансамбляў Докшыцкага раёна.

**Матэрыялы і абсталяванне:**

- фотаздымкі,
- геаграфічныя карты і планы мясцовасці,
- раздатачны матэрыял (Легенды і паданні Докшыцкага краю)

**Літаратура:**

- Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка  Докшыцкага раёна
- В.Г. Антипов. Парки Белоруссии.

## Ход падарожжа

### I. Арганізацыйная частка

### II. Страчаная спадчына

***Тут самыя чысцейшыя крыніцы,***
***Пясчаныя палі сярод лясоў.***
***Тут суджана было ім нарадзіцца***
***І бегчы з незапамятных часоў.***

*Юрась Свірка*

- Гэты ўрывак з верша нашага земляка Юрася Свіркі яскрава гаворыць аб багатай культурнай і прыроднай спадчыне нашага раёна, якая прыцягвае кожнага сваёй непаўторнай прыгажосцю і велічнасцю.

Сядзібава-паркавыя ансамблі ў мінулым з’яўляліся складанымі комплексамі суадносных архітэктурных і прыродных элементаў, незвычайным культурным, духоўным і інтэлектуальным асяродкам. Іх узнікненне выходзіць з глыбокай даўніны і звязана з існаваннем двароў і маёнткаў. Сядзібы прайшлі складаны шлях эвалюцыі ад старадаўніх умацаваных да добра пабудаваных рэнесансных двароў і далей да мастацкіх ансамбляў часоў барока, класіцызму і рамантызму. Вялікай разнастайнасцю архітэктурных форм вызначалася эпоха эклектыкі, якая стала апошняй у развіцці сядзібнага дойлідства. Такі доўгі шлях развіцця ў рэчышчы агульнаеўрапейскай культуры з улікам мясцовых традыцый, сацыяльна-эканамічных умоў, а таксама ўкладу жыцця і эстэтычных густаў уладальнікаў прайшлі сядзібы Докшыцкага краю.

- Сёння, паважаныя сябры, мы паспрабуем з вамі здзейсніць невялікае завочнае падарожжа па тых вёсках, дзе яшчэ можна знайсці хоць нейкія рэшткі былых панскіх маёнткаў. А скажыце, якія гэта вёскі?

***(Кіякова, Сітцы, Бярозаўка, Гнядзілава)***

- Малайцы! Вось па гэтых мясцінах і будзе пралягаць наша сённяшняе “падарожжа”. Аднак, перш чым адправіцца ў “падарожжа”, я хачу прыгадаць вам адзін факт. Напэўна ніхто з вас не ведае, што самая старажытная сядзіба на тэрыторыі раёна была менавіта ў Докшыцах. У 1560 годзе тут быў двор з чэлядзю нявольнай, існавала праваслаўная царква. Сядзіба мела невялікі прыгожы драўляны аднапавярховы палац з чатырохсхільным дахам. Яго парадны фасад упрыгожваў чатырохкалонны порцік з незвычайным па форме паўкруглым франтонам, а вуглы – пілястры. З правага боку параднага партэра з традыцыйным кругам стаяла таксама невялікая двухпавярховая афіцына, за якой мясціліся іншыя службовыя і гаспадарчыя пабудовы. Апошняй вядомай літаратурнай крыніцай аб сядзібе з’яўляецца інвентар за 1854 год.

## ІІІ. Першы дзень пахода

- І так, юныя падарожнікі, дарога прывяла нас да вёскі Кіякова. Тут мы зробім невялічкі прыпынак. А каб адпачынак прайшоў з карысцю – зробім кароткі экскурс ў гісторыю Кіякова і ўспомнім асноўныя этапы яго развіцця. Паглядзіце, калі ласка, на карту і адкажыце – на беразе якой ракі размясцілася вёска?

***(Левы бераг ракі Сэрвач)***

- Месца для сядзібы Кіякоўскія, уладальнікі вёскі ў канцы ХІХ – пачатку ХХ стагоддзяў, выбралі з густам. Яны заклалі яе на невысокай тэрасе ракі. Сядзіба мела простую планіроўку. Сам палац з верандамі і тэрасамі на двух фасадах складаўся з 14 пакояў і разяшчаўся ў глыбіні парка. Непасрэдна сам парк быў спланаваны на паўднёва-усходняй ускраіне сядзібы. У плане ён Г-падобны і складаўся з дрэў мясцовых відаў. Яго найбольш утульная і прыгожая частка размяшчалася з боку ракі, дзе раслі векавыя яліны, дубы і бярозы. Менавіта адсюль адкрываецца прыгожы від на раку і пойму.

Ад вялікага гаспадарскага двара захаваліся стайня і ферма. Стайня пабудавана з бруса, закладзенага ў цагляныя шулы. Фасад вылучаны двума рызалітамі са шчытамі. Іх дзвярныя праёмы маюць арачнае завяршэнне і прыгожыя дзверы работы мясцовых майстроў.

Ферма пабудавана ў 1938 годзе ў стылі “цаглянай” архітэктуры. У плане П-падобная і мела вялізныя памеры – 42 на 33 метры. Фундамент складаецца з колатага каменя, шчыльна падагнанага на цэментнай звязцы. Сцены цагляныя, а кладка тыпу рад “латок”, рад “тычок”. Цэгла гатавалася на цагельні ў вёсцы Валкалата. Ферма з’яўлялася ўзорам гаспадарчых пабудоў такога тыпу.

Захаваўся таксама свіран з 15 вянцоў і незвычайная лядоўня, якая ўключае склеп, паўпаверх складзены з колатых валуноў, а франтон, вуглы, дзвярныя праёмы – з чырвонай цэглы. Выдзяляецца формай, прыгожым спалучэннем каменя, цэглы і мацункам выканання.

У 1907 годзе Кіякоўскімі будуецца капліца ў неарэнесансным стылі. Цагляны, атынкаваны будынак упрыгожаны пілястрамі. На галоўным фасадзе над лучковым дзвярным праёмам размешчана акно, а да тэрасы вялі бакавыя лесвіцы. Пад тэрасай зроблены ўваход у крыпту. Сярод сямі пахаваных у крыпце – Марыя Кіякоўская з Яблаunion (1876 – 1906), жонка Багдана, апошняга ўладальніка ад другой сядзібы Кіякоўскіх (належала Эдмунду), якая размяшчалася сярод поля.



*Капліца у Кіякова*



- А зараз, давайце паспрабуем разгадаць невялічкі красворд. У выдзеленых клетках павінна атрымацца назва вёскі:

1. Прозвішча ўладара сядзібы.
2. Які будынак пабудавалі гаспадары сядзібы ў Кіякове 1907 годзе?
3. Як называецца гаспадарчая пабудова для ўтрымання коней.
4. Як называецца памяшканне, дзе пахаваны члены роду Кіякоўскіх?
5. Памяшканне з лёдам або снегам для захоўвання прадуктаў.
6. Гаспадарчае збудаванне для захоўвання збожжа.
7. На беразе якой ракі размясціліся сядзіба і парк?

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | **1.** | К | і | я | **К** | о | ў | с | к | і |
| | **2.** | К | а | п | л | **І** | ц | а | | | |
| **3.** | С | т | а | й | н | **Я** | | | | | |
| | | | | | **4.** | **К** | р | ы | п | т | а |
| | | **5.** | Л | я | д | **О** | ў | н | я | | |
| | | | | **6.** | С | **В** | і | р | а | н | |
| | **7.** | С | э | р | в | **А** | ч | | | | |

- Малайцы! Вось і скончыўся наш перапынак. Але, перш чым мы пакінем вёску Кіякова, я хачу зачытаць вам адзін урывак з газеты “Родныя вытокі”, які быў надрукаваны 16 ліпеня 2005 года. Ён датычыцца гісторыі аднаўлення кіякоўскай капліцы.

Паслухайце: “Цяжка паверыць, што капліца магла перастаць існаваць. Паўкруглыя вокны былі разбітыя, жалезныя дзверы адчынены. На ветры яны скрыпелі, скрыгаталі. З вакон вылятали вароны. Цэментная падлога была засмечана, а сцены абшарпаныя і пабітыя кулямі. У падвале былі разбураны пячуркі і нават валяліся выкінутыя астанкі чалавечых касцей. Кажуць, што такім чынам несумленныя чалавечыя асобіны шукалі сродкі для ўзбагачэння, бо там быў пахаваны род мясцовых паноў Кіякоўскіх. Як вядома, Аляксандр быў бяздзетны і выхоўваў сына сястры – Багдана. Аднак, што здарылася з Багданам – невядома. Вяскоўцы кажуць, што ён быў добрым чалавекам, не крыўдзіў працуючых на яго парабкаў і нават меў прыхільнасць да партызан. Кажуць, што ён дапамагаў ім харчаваннем, а затым і сам пайшоў у лес, дзе і загінуў. Праўда, дакладных звестак пра гэта няма. А вось унук Багдана жыве ў Польшчы і ў пачатку 90-х гадоў XX стагоддзя прыязджаў у Кіякова. Пакінуў мясцоваму жыхару грошы і прасіў узнавіць родавы склеп (капліцу). Чалавек той, богабаязны, узяўся за работу, а дапамагалі яму ўсе жыхары бліжэйшых вёсак. І вось з сярэдзіны 90-х капліца дзейнічае”.





- Ну, што, адпачылі? Паглядзіце, калі ласка, на карту і адкажыце – у якім накірунку нам трэба рухацца, каб трапіць у вёску Сітцы?

***(На поўдзень)***

## IV. Другі дзень пахода

- Вось, сябры, мы і дабраліся да вёскі Сітцы. Перш чым мы пачнём экскурсію па гэтай вёсцы, давайце я вам прачытаю адзін верш, які напісала вучаніца Сітцаўскай сярэдняй школы Таццяна Сарока:

Родная вёска! Ты – казка жывая.
Не ведаю, ява ці сон, можа сніцца.
Дуб пяты век тут дажывае...
Назва якая прыгожая – Сітцы.
Сітцы... Рассеяны хаты, як сіта.
Ці, можа, сітнёг гэту назву нам кінуў?
Сітцам дарогу ўсцілалі, нібыта
У час, калі ехала тут Кацярына.

Вежы, калоны, брама старая,
Дуб векавечны, царква, агароджа –
Усё аб мінуўшчыне напамінае,
А ўспамін той душу мне трывожыць.

- Як вы змаглі заўважыць – у вершы Таццяна змагла даць кароткую абагульняючую характарыстыку свайму населеннаму пункту: нагадала асноўныя легенды аб паходжанні назвы вёскі Сітцы, пералічыла гістарычныя і культурныя аб’екты сваёй малой радзімы, а таксама змагла прызнацца ў шчырай любві да роднай вёскі.

Ну а мы пачнем вывучэнне Сітцаў з легенд. Я вам коратка іх нагадаю. Вёска Сітцы ўпершыню ўпамінаецца ў 1545 годзе. Лічыцца, што назва вёскі мае ландшафны характар: зараснікі водных сітняг і прыбярэжных раслін (сітнік). Але існуе яшчэ некалькі легенд пра назву вёскі.

Даўным-даўно пачалі сяліцца людзі ў гэтай мясцовасці. Бедныя хаткі гэтых людзей размяшчаліся ў беспарадку, там і тут, як бы ў выглядзе сіта. Адсюль – Сітцы, або Сітца, што можна зразумець як малое сіта.

Успамінаюцца радкі з паэмы Янкі Купалы “Курган”:

Сонных вёсак шары,
Хат амшалых, як мар...

Гэтыя “шары” напамінаюць, што, сапраўды, ў той час хаты ў вёсцы размяшчаліся як бы па акружнасці. Чарговаму землеўладальніку не спадабалася такое размяшчэнне сялянскіх сяліб, таму што ён інакш планаваў свае зямельныя ўгоддзі. Па яго загаду “непатрэбныя” хаты былі спалены і ў выніку ў вёсцы Сітцы засталася адзіная вуліца, якая зараз называецца “цэнтральная”.

Ёсць яшчэ адна прыгожая легенда. У даўнія часы людзі даведаліся, што праз іх мясціны будзе ехаць царыца Кацярына Вялікая. Паколькі гэтыя мясціны былі балоцістыя, было вырашана дарогу, па якой мелася ехаць царыца, выслаць тканінай – сітцам. Праязджаючы, Кацярына Вялікая здзівілася: “Ваша мясцовасць багата на сіцец!” З таго часу вёску пачалі зваць Сітцы.

- А цяпер паглядзіце на месцапалажэнне вёскі Сітцы на карце і адкажыце, якая з легенд, на вашу думку, мае права быць найбольш верагоднай? Адказ абгрунтуйце.

- А зараз наша гаворка пойдзе аб уладальніках Сітцаў. Як вядома, першымі ўладальнікамі вёскі былі Бжастоўскія. Гэта магутны шляхецкі род у Вялікім княстве Літоўскім, вядомы яшчэ з XVI стагоддзя. Потым мясцовасць адыйшла да роду Дамейкаў. Вось з гэтым родам уладароў Сітцаў мы пазнаёмімся больш падрабязна. Аднак знаёмства наша будзе праходзіць у выглядзе самастойнай работы. Для гэтага вам неабходна адкрыць старонкі 675 – 676 гісторыка-дакументальнай хронікі “Памяць. Докшыцкі раён” ці старонкі 16 – 23 метадычных рэкамендацый аб правядзенні паходаў “Сядзібы і паркі”. Перад вамі будзе стаяць задача – пазнаёміўшыся з гэтым матэрыялам, скласці генеалагічнае дрэва роду Дамейкаў.

*У 1798 годзе маёнтак адыйшоў да роду Дамейкаў герба Дангель. Першым гаспадаром з іх быў Тадэвуш (1762 – 1838), сын Казіміра (н. ў 1725), скарбніка інфляндскага і каралеўскага, камісара віленскага, і Багумілы Адахоўскай з Свентаржэцкіх. Тадэвуш, мечнік мсціслаўскі (1788), падсудак Віленскага павета (1801), падкаморы (1817), быў жанаты на Схаласцыне (1768 – 1827). Яны мелі сыноў Стафана Аляксандра (1804 – 78), Казіміра Франца (1805 – 75) і Люцыяна Вінцэнты (н. ў 1808), якія даводзіліся стрыечнымі братамі знакамітаму Ігнату Дамейку. Яго бацька Антоні Гіпаліт (1764 – 1809) быў жанаты на Караліне з Анцутаў, даводзіўся родным братам Тадэвушу і валодаў маёнткам Мядзведкі. Наогул, род Дамейкаў меў шмат маёнткаў на абшарах сучаснай Беларусі і сярод іх Сітцы. Так, у "Літоўскай метрыцы" 1864 года адзначалася, што ў памесці Дамейкаў 104 рэвізіўныя душы, царква драўляная Святога Ежы, узведзеная ў 1710 годзе і перабудаваная ў 1819 годзе. Маецца сельская школа – 32 вучні. Праваслаўная парафія адносіцца да Мядзельскага благачыння. Акрамя школы ў Сітцах у парафіі былі царкоўныя школы ў вёсках Грабучае, Грынеўшчына, Дзядкі. У склад сельскай акругі ўваходзіла 9 вёсак (521 рэвізійная душа). Гміна Сітцы складалася з 5 сельскіх акруг.*

*Па спадчыне Сітцы разам з Гервятамі адыйшлі старэйшаму сыну Стафану Аляксандру, жанатаму на Сафіі з Брахоцкіх (1814 – 99). Стафан, часцей называўся Аляксандрам, быў маршалкам дваранства Віленскага павета (1832), меў званне камергераюнкера (1834), потым званне камергера і тайнага саветніка. З 1855 года і да канца жыцця з'яўляўся маршалкам дваранства Віленскай губерні. Быў вельмі лаяльны да царскай улады, асуджаў паўстанне 1863 – 64 гадоў.*



**Вацлаў Дамейка**

*Пасля смерці бяздзетнага Аляксандра і Соф'і Дамейкаў у 1899 годзе ўладальнікам памесця стаў пляменнік Аляксандра Дамейкі з Гервят Вацлаў Дамейка (1854 – 1935), сын брата Казіміра, ўладальніка Гервят. Апошні Дамейка быў лагодны, прыемны, здольны, адзначаны кемлівасцю да гісторыі прыроды: насякомыя, матылі, мінералы для яго былі найкаштоўнейшымі цацкамі. Вацлава любілі за добрае сэрца. Ён ніколі нікому не адмовіў, калі хто аказваўся ў бядзе. Патомак Дамейкаў – Марыўш Германовіч, які зараз жыве ў Францыі, піша ўспаміны сваёй маці: "Дзядзечка Вацлаў, родны брат бабулі Леоніі, якога мы называлі "дзядзя", звычайна суправаджаў нас у паездках, калі мы ездзілі па вёсках і адорвалі вясковых дзяцей цукеркамі, а, таксама, быў з намі пры выездах за мяжу для "навукі і здароў'я". Дзядзя быў вельмі добры, меў залатое сэрца, нікога не пакрыўдзіў, нас жа псаваў вельмі". Пры Вацлаве Дамейку Гервяты і Сітцы сталі адным цэлым. Пасля смерці Вацлава ў 1935 годзе Сітцы перайшлі да яго сястры Леаніды Паплаўскай (у дзяцінстве Дамейка) з Сурвілішак (1858 – 1951). Тады агульная плошча разам з фальваркамі Ямнае, Вянюціна, Дзеркаўшчына складала 2140 га, дзе палавіну гэтай плошчы складалі лясы.*

# Генеалагічнае дрэва Дамейкаў



- А зараз пагаворым аб самой сядзібе. Бжастоўскія надалі ёй характэрныя рысы барока. Яна мела выразную і працяглую кампазіцыйную вось і сіметрычна-восевую будову. Уваход фіксуецца вялізнай трох’яруснай



брамай, пабудаванай з буйнапамернай цэглы. Завяршаецца брама невялікай вежай з купалам. Брама мела драўляны механізм, які забяспечваў ход гадзінніка з “зязюляй”, зроблены мясцовым майстрам. Калі біў гадзіннік, сяляне спынялі работу, не брыдкасловілі, а мовілі: “Радуйся, Марыя”, хвалілі айца, сына і святога духа. Цяжкаватае на выгляд збудаванне знешне нагадвае манастырскую браму-званіцу. З левага боку да брамы прымыкала выцягнутае на двух узроўнях цаглянае збудаванне, якое называлася кашара. Было, відаць, мясцовай формай кардыгардый, якія будаваліся пры замках, гарадскіх валах і прызначаліся для размяшчэння варты або гарнізона.





Ад брамы ўздоўж галоўнай восі ідзе ліпавая алея. Захаваліся часткова 4 пілоны былога порціка параднага фасада, фрагменты скляпенняў. Порцік складаўся з 6 пілонаў і накрываў трохвугольным шчытом увесь дом і дах з гонту. А ў палацавых склепах захоўваліся разнастайныя дамашнія



наліўкі, мяды, віны. Падземныя хады выводзілі людзей у час небяспекі ў прыдатнае месца – востраў на балоце каля Ямнага.

Перад палацам, на пад’язным крузе, расла велічная двухствольная ліпа. Каля яе ляжаў валун. Існуе легенда пра няньку, якая ненарокам выпусціла з акна палаца панскае дзіця. Гаспадары яе люта пакаралі – жывую загадалі закапаць у яму, а на магілу паставіць вялікі камень.



*Сядзібны дом Дамейкаў. На заднім плане — аранжарэя. Здымак 1930-х гадоў*

За палацам быў спланаваны парк у выглядзе шасці прамавугольных баскетаў. Баскеты ўтваралі алеі, у якіх ліпы былі пасаджаны вельмі шчыльна – праз 0,5 метра. Кроны дрэў фармаваліся на вышыні 5 метраў, і алеі мелі выгляд зялёных калідораў. У іх сценах былі нішы, якія служылі альтанкамі. Ад часу ліпы маюць ужо нездаровы выгляд, сухія галіны, ствалы пакрываюцца імхамі і лішайнікамі, але яшчэ выразна перадаюць асаблівасці планіроўкі барочнага парку.

Аляксандр перапланаваў і пашырыў сядзібу. Яна набыла рысы пераходнага перыяду ад барока да класіцызму. Кампазіцыйным цэнтрам становіцца новы палац – невялікі драўляны аднапавярховы будынак з шасцікалонным порцікам на парадным фасадзе, крыты гонтам. На тыльным баку будынка, абвітым дзявочым вінаградам, меўся ганак з трохскатным дахам. Да будынка прымыкала аранжарэя – цэнтрычная ў плане будова з канічным дахам. У ёй нават зімой цвілі пахучыя і прыгожыя кветкі, раслі экзатычныя расліны. Зімой вялікая шкляная аранжарэя атаплівалася, а летам у ёй было душна. Да столі падымаліся араўкарыі, пальмы, эўкаліпты, лімоны, апельсіны, цвілі ружы. Мяркуюць, што араўкарыю ў аранжарэю прыслаў з Чылі Ігнацій Дамейка. На вінаграднай лазе вырошчвалі вінаградных смаўжоў. Далікатэс адпраўлялі ў Варшаву і іншыя еўрапейскія краіны.

Фарміруюцца новыя пейзажныя кампазіцыі ў паўночнай частцы сядзібы. Старажытны курган на ўскраіне парку, авеяны легендамі, служыць відавым узгоркам. Раней хадзілі чуткі, што гэта брацкая магіла нападаючых рыцараў і абаронцаў.

Адзначаная планіроўка добра прасочваецца цяпер. Толькі былыя групы дрэў прынялі выгляд самкнутых складаных насаджэнняў. Дрэвы разрасліся і закрылі былыя перспектывы. На ўскраіне парка знаходзіцца помнік прыроды рэспубліканскага значэння – Дуб-велікан, якому амаль 500 гадоў. Яго вышыня 26 метраў, дыяметр – 2 метры. Ён сімвалізуе стойкасць і моц, стабільнасць і размеранасць жыццёвага шляху. Паводле народнага падання пад дубам адпачываў нацыянальны герой Польшчы Тадэвуш Касцюшка. За шматгадовую гісторыю пад кронай дуба адбываліся многія падзеі: і радасныя, і трагічныя. Каб ён мог размаўляць, то абавязкова расказаў бы аб трагічнай гісторыі, якая адбылася на пачатку 20-х гадоў XX стагоддзя.



***Дуб-велікан у Сітцах***

*Ішла грамадзянская вайна. Чырвоная Армія адступала і яе разбітыя часці рухаліся на ўсход. Аднойчы ў парку, як раз пад дубам, спыніўся палявы лазарэт. У суправаджэнні дзвюх маладых сясцёр міласэрнасці на дзвюх фурманках везлі параненых чырвонаармейцаў. Жыхары Сітцаў і суседніх вёсак ад душы дзяліліся з імі хто чым мог. Накарміўшы і перавязаўшы параненых, сёстры міласэрнасці ляглі адпачываць, а санітары павялі на луг пасвіць коней. Ноччу на лазарэт наляцела банда польскіх уланаў, якая была арганізавана і ўзброена на сродкі паноў Дамейкаў. На чале яе стаяў асаднік. Бандыты шашкамі пасеклі раненых, потым прымусілі мясцовых жыхароў выкапаць у парку яму і пахаваць там ахвяры. Над маладымі медсёстрамі доўга здзекваліся, а потым у непрытомным стане, жывых, кінулі ў магілу. Забраўшы няхітры скарб палявога лазарэта, банда пакінула Сітцы. Вярнуўшыся ў свой маёнтак, Іван Дамейка не ўпадабаў, што ў яго парку пахаваны чырвонаармейцы. Ён загадаў зруйнаваць магілу і пасадзіць на ёй*

*дрэвы, але тыя засохлі, і тады гэта месца засеялі травой. У 1940 годзе па факту гэтага забойства была ўзбуджана крымінальная справа. Удалося адшукаць і арыштаваць главара банды і некаторых яе членаў. А з чырвонаармейцаў у жывых застаўся адзін санітар.*

- А вы ведаеце, што пабываўшы ў Сітцах, Пятрусь Броўка прысвяціў дубу верш “Балада пра дуб саўгаса “Сітцы”, у аснову якога ляглі падзеі, што адбыліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Акрамя таго, цудоўным дубам любаваліся такія вядомыя дзяржаўныя дзеячы, як С.Прытыцкі, П.Машэраў, У.Лабанок. Пад кронай магутнага прыгажуна адзначыў сваё 50-годдзе народны артыст СССР і БССР Ф.Шмакаў. Павёз на памяць фотаздымак дуба першы састаў ансамбля “Песняры”, які тады меў назву “Лявоны”. Чуў дуб і палымяныя выступленні народных пісьменнікаў М.Танка, І.Шамякіна. У творах І.Мележа, П.Броўкі, М.Калачынскага ёсць радкі, прысвечаныя сітцаўскаму дубу. Пад ім піў медавуху жывая легенда Беларусі Р.Шырма, выконваў свае творы тады яшчэ малады кампазітар І.Лучанок. Гучалі тут галасы Юрыя Смірнова, Тамары Раеўскай. Гасцямі Сітцаў былі П.Панчанка, А.Ставер, В.Быкаў, Р.Барадулін і многія іншыя дзеячы культуры.

Недалёка ад дуба можна назіраць адзін з баскетаў, які знаходзіцца ў заходняй частцы сядзібы. Напэўна, пазней ён стаў месцам размяшчэння парнікова-цяплічнай гаспадаркі. Ён мае бутавую сцяну вышынёй да 2,5 метраў, таўшчынёй 0,7 метра, завершаную чарапічнай дахоўкай. Нішы сцяны, якія добра захавалася, спрыялі вырошчванню вінаграднай лазы, адзіныя расліны якой вяліся яшчэ ў апошні час. У склад бакавой агароджы быў уключаны домік агародніка, пабудаваны з цэглы, і невялічкая вяндлярня, якая аднначасова служыла паркавым павільёнам. Зараз тут знаходзіцца магазін.



І менавіта з Вацлавам звязаны апошні этап у развіцці сядзібы ў Сітцах. Быў адноўлены гаспадарчы двор, пабудаваны жылыя дамы. Новыя пабудовы занялі паўднёва-усходнюю частку сядзібы і часткова захаваліся. Двор прамавугольны ў плане. Будынкі размешчаны па перыметры. Архітэктурную цікавасць з іх уяўляе двухпавярховы будынак з цэглы. Таўшчыня яго сцен 71 сантыметр. Ніжні паверх прадстаўлены амаль квадратнымі ў плане камерамі, перакрытымі крыжовымі скляпеннямі. Вуглы і фасады сцен умацаваны эскарпамі. Будынак знешне нагадвае манастырскі корпус або гандлёвы рад.



Другі будынак вялікіх памераў 56 на 16 метраў. Канструкцыю сцен трымаюць моцныя мураваныя шулы, атынкаваныя, з украпінамі чорнага шчэбню. Пралёты даўжынёй 7 метраў закладзены шасцю сасновымі вянцамі, адзін ніжні – дубовым. У 1934 годзе

сядзіба атрымала новую агароджу (дата выкладзена чорным шчэбнем), аснову якой складаюць магутныя бутавыя пілоны (130 на 80 см), завершаныя бетонавымі плітамі.

- А цяпер, каб замацаваць веды, вам прапануецца невялічкі красворд. Для яго рашэння можна выкарыстоўваць матэрыялы з прапанаваных дапаможнікаў.

**Па гарызанталі:**

1. З чаго складаўся порцік параднага фасада сядзібы?
2. Назавіце аўтара верша “Родная вёска! Ты – казка жывая…”
3. З кім з Дамейкаў звязаны апошні этап у развіцці сядзібы ў Сітцах?
4. Хто былі першыя ўладальнікі вёскі Сітцы?
7. Ад каго, згодна адной з легенд, пайшла назва вёскі Сітцы?
8. Хто, згодна народнага падання, калісьці адпачываў пад дубам-волатам?
9. У якой вёсцы пахаваны прадстаўнікі роду Дамейкаў?
11. Як называўся афіцыйны ўваход на панскую сядзібу?
12. Хто са знакамітых беларускіх пісьменнікаў прысвяціў баладу сітцаўскаму дубу-волату?

**Па вертыкалі:**

1. Якое прозвішча было ў сястры Вацлава Дамейкі, да якой у 1935 годзе перайшла сядзіба?
2. Які “далікатэз” вырошчвалі Дамейкі ў сваім парку?
4. У якім стылі была пабудавана сядзіба ў Сітцах?
5. Пабудовы, якія размяшчаліся пры замках, гарадскіх валах і прызначаліся для размяшчэння варты.
6. Да якога роду ў 1798 годзе адыйшоў маёнтак у Сітцах?
10. Якое прозвішча аднаго з патомкаў Дамейкаў, які зараз жыве ў Францыі?

| | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | **1.** | | | | | | | | |
| | | | | | | **2.** | | | | **1.** | П | і | л | о | н | | | | |
| | | | | | **2.** | С | а | р | о | к | а | | | | | | | | |
| | | | | | | м | | | | | п | | | | | | | | |
| | | | | | | о | **3.** | В | а | ц | л | а | ў | | | | | | |
| | | | | | **4.** | ў | | | | | а | | | | | | | | |
| | | **5.** | | **4.** | Б | ж | а | с | т | о | ў | с | к | і | я | | | **6.** | |
| | | К | | | а | | | | | | с | | | | | | | Д | |
| **7.** | К | а | ц | я | р | ы | н | а | | **8.** | К | а | с | ц | ю | ш | к | а | |
| | | ш | | | о | | | | | | а | | | | **10.** | | | м | |
| | | а | | | к | | **9.** | Р | а | п | я | х | і | | Г | | | е | |
| **11.** | Б | р | а | м | а | | | | | | | | | | е | | | й | |
| | | а | | | | | | | | | | | | **12.** | Б | р | о | ў | к | а |
| | | | | | | | | | | | | | | | м | | | а | |
| | | | | | | | | | | | | | | | а | | | | |
| | | | | | | | | | | | | | | | н | | | | |
| | | | | | | | | | | | | | | | о | | | | |
| | | | | | | | | | | | | | | | в | | | | |
| | | | | | | | | | | | | | | | і | | | | |
| | | | | | | | | | | | | | | | ч | | | | |

## V. Трэці дзень падарожжа

- Да наступнай вёскі Бярозаўка нам трэба рухацца вельмі многа. Таму, уявім сабе, што гэты шлях мы пераадолелі на аўтобусе.

І вось мы знаходзімся ў цэнтры вёскі Бярозаўка. Давайце ўспомнім легенду аб паходжанні вёскі:

*Гэта было вельмі даўно... Сярод лесу стаяла адна хаціна, а жыла ў ёй бедная, але прыгожая дзяўчына – Алена. Ля хаціны цёк чысты, блакітны ручай. Пакахала аднойчы дзяўчына Алена аднаго маладога паніча, які прыехаў сюды з далёкага краю, жыў ён у панскім маёнтку. Сустрэліся яны каля ручаіны, калі малады паніч быў на паляванні. Потым былі сустрэчы, пацалункі, абяцанкі. Але каханне паніча было нядоўгім. Паехаў ён у далёкую краіну. Алена засталася адна. Доўга яна чакала маладога паніча, клікала яго, слязьмі залівалася. Але ён не прыйшоў. Прасіла дзяўчына ручай, сонейка, каб вярнулі каханага. Але нічога не дапамагло. Засталася Алена адна. Доўга яна стаяла ў адзіноце на тым месцы, дзе сустрэліся яны з панічам. А потым, як гавораць людзі, знікла, сышла Алена, а куды, ніхто не ведае. Мабыць паніча пайшла шукаць. А ля ручаіны вырасла танклявая белая бяроза. Яна і дала пачатак бярозаваму гаю за вёскай. А ля хаціны дзяўчыны пачалі сяліцца людзі, а месца, дзе сяліліся, пачалі называць "ля бярозы", "ля бярозкі", Бярозаўкай.*

У цэнтры вёскі можна ўбачыць рэшткі былой сядзібы, якую пабудавалі Свентаржэцкія. У XIX стагоддзі ёй валодаў Уладзімір Свентаржэцкі. Існуе меркаванне, што ён быў родзічам вядомага палітычнага дзеяча Беларусі Баляслава Часлававіча Свентаржэцкага, аднаго з кіраўнікоў паўстання 1863-64 гадоў. Б.Свентаржэцкі служыў у Мінскім дваранскім дэпутацкім сходзе, а як член Мінскага губернскага камітэта ўдзельнічаў у распрацоўцы ўмоў сялянскай рэформы 1861 года. З 1863 года знаходзіўся ў эміграцыі ў Францыі.

Двор Уладзіміра Свентаржэцкага вызначаўся памерамі. Дваровых было каля 26 чалавек, прыгонных сялян – 216 (41 двор). Зямлі даводзілася па 3 дзесяціны на двор. Павіннасці былі нялёгкімі: па 156 мужчынскага і жаночага прыгону з двара, 8 згонаў з чалавека, 2 курыцы з двара, 20 штук яек, 3 гарнца ягад, 60 штук грыбоў, дзве дарогі ў год па 150 вёрст у абодва канцы, начная варта па чарзе.



Сядзіба ствралася ў некалькі этапаў, таму вызначыць дакладна яе першапачатковую планіроўку цяжка. У апошні час прыняла эклектычныя рысы. З XIX стагоддзя добра захаваліся 2 вадаёмы на мясцовым вадатоку, адзін з іх (заходні) асабліва вялікі (да 2 га). Маляўнічае люстэрка вады з востравам, якое абкружана вербамі з экзатычнымі кронамі, прыдае сядзібе рысы

велічнасці з боку ўезда. На беразе ў 1862 годзе быў пабудаваны бровар (зараз выкарыстоўваецца як млын), тыповае вялікае збудаванне (28 на 8 м) з цэглы з павышаным цэнтральным аб'ёмам і двума ніжэйшымі бакавымі. Яго гадавая прадукцыя складала 17 тысяч вёдзер спірту.



*Бровар*

Сядзіба не мае выразнай асноўнай восі. Вадаёмы і парк кампазіцыйна не звязаны з яе парадная часткай. Сядзібны дом размяшчаўся збоку адносна вадаёмаў і парку, да яго прымыкаў гаспадарчы двор. Парк спланаваны па тыпу эканамічнага ў выглядзе баскета. Яго ўтвараюць лінейныя пасадкі ліпы рознага ўзросту. Усходняя алея мае ўзрост больш за 150 гадоў і з'яўляецца фрагментам былой сядзібнай кампазіцыі. Размешчана на адной восі з дамбай паміж вадаёмамі. Ліпы ўтвараюць суцэльную сцяну, месцамі ў ніжняй частцы ствалы зрасліся, вышынёй 25-27 метраў. Усходняя алея закладзена прыкладна ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў.



*Алея у Бярозаўцы*



*Былая капліца*

Яна добра захавалася, праходзіць уздоўж вуліцы вёскі: шырыня 6 метраў, вышыня дрэў 22-25 метраў. Прастора баскета служыла садам. У канцы яго была пабудавана Козел-Паклеўская капліца (захаваліся сцены). Ізаляванасць, утульнасць капліцы надавала абсадка з боку сада двума радамі бэзу і рабіннікам. Адпаведна ім пракладзены паўкруглы канал, цераз які на восі капліцы меўся масток. У садзе, бліжэй да палаца, ліпы, пасаджаныя шчыльна ў выглядзе авала, утвараюць альтанку. У ёй была падлога, стаяў стол.

- Вось мы пазнаёміліся яшчэ з адным месцам, дзе калісьці размяшчалася панская сядзіба. Па традыцыі, вам прапануецца разгадаць зноў невялічкі красворд.

1) У якім выглядзе быў пасаджаны парк у вёсцы Бярозаўка?
2) Назавіце імя аднаго з родзічаў рода Свентаржэцкіх.
3) Які будынак з сядзібы Свентаржэцкіх выкарыстоўваецца і зараз?
4) Сааўтарам якога дакумента з'яўляўся Свентаржэцкі ў 1861 годзе.
5) Якімі раслінамі была абсаджана капліца ў сядзібе Свентаржэцкіх?
6) Назавіце імя ўладальніка Бярозаўскага маёнтка.
7) Якую назву насіла капліца?
8) Якую пабудову стварылі шчыльна пасаджаныя авалам дрэвы?
9) Якая парода дрэў пераважала ў маёнтку Свентаржэцкіх?

| | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | 1 | **Б** | а | с | к | е | т | |
| | | | | | | | | 2 | Б | а | л | **Я** | с | л | а | ў | | |
| | | | | | | | | | | 3 | Б | **Р** | о | в | а | р | | |
| | | | | | | | | 4 | Р | э | ф | **О** | р | м | а | | | |
| | | | | | | | | | 5 | Б | э | **З** | | | | | | |
| | | | | | | | | | 6 | У | л | **А** | д | з | і | м | і | р |
| 7 | К | о | з | е | л | - | П | а | к | л | ё | **Ў** | с | к | а | я | | |
| | | | | | 8 | А | л | ь | т | а | н | **К** | а | | | | | |
| | | | | | | | | 9 | Л | і | п | **А** | | | | | | |

- Апошні пункт нашага “падарожжа” – вёска Гняздзілава. Гэта адно з самых старадаўніх паселішч Докшыцкага раёна. Яно вядома яшчэ 13 студзеня 1407 года. Менавіта ў гэты дзень Гняздзілавічы (“няздзілавічы” (“nezdylowycy”) – так тады называлася вёска)) упершыню ўпамінаюцца ў пацвярджальнай грамаце вялікага князя Вялікага княства Літоўскага, выдадзенай віленскаму ваяводзе Войцеху Манівіду. У 1567 годзе Гняздзілавічы згадваюцца сярод маёнткаў М.Ю. Радзівіла Рудога, які ў 1570 годзе здаваў іх у “заставу” (заклад) В. Тышкевічу. Радзівілаўская частка Гняздзілавіч была далучана да маёнтка Жупраны ў Ашмянскім павеце. У пачатку XVIII стагоддзя Гняздзілавічы належалі Рудамінам-Дусяцкім, якія і заклалі тут сядзібу і парк. Ад Рудамінаў Гняздзілавічы закладзены кляштару кармелітаў у Глыбокім. Уваходзілі ў Ашмянскі павет Віленскага ваяводства. У 1793 годзе адыйшлі да Расійскай Імперыі, а ў 1882 годзе маёнтак Гняздзілава быў узяты ў дзяржаўны скарб, і ў канцы XIX стагоддзя перайшоў ва ўласнасць Козел-Паклёўскіх, потым – Слатвінскіх.

- Вось аб Слатвінскіх мы зараз і пагаворым.

Да прыходу Савецкай улады ў Слатвінскіх было 12 маёнткаў, якія знаходзіліся на тэрыторыі Польшчы. Потым гэта колькасць рэзка скарацілася. Нам вядома, што ў Слатвінскага было два сыны – Міраслаў і Людвіг. Міраславу належалі землі, размешчаныя ў Гняздзілава і Параф’янава, а Людвігу – Дзедзіна і Замошша, што каля Крулеўшчыны. Аб лёсе бацькі панічоў амаль нічога невядома. Дакладна толькі тое, ўто ён загінуў у Мінску ад бомбы.

Маці звалі пані Марыя. Пасля гібелі мужа яна доўгі час адна выхоўвала сыноў. Але ў 50 год (прыкладна так сцвярджаюць відавочцы) яна выйшла замуж за пана Хмару, які быў намнога маладзей за яе (ён вучыўся разам з адным з сыноў). Жылі яны ў асноўным у Вільна.

Сядзіба Міраслава (старэйшага сына пана Слатвінскага) знаходзілася ў Гняздзілаве (зараз гэту мясцовасць называюць в. Двор). Міраслаў па характару быў вельмі добрым чалавекам. Ён быў сярэдняга росту, але важыў прыкладна 120 кілаграм. Нягледзячы на сваю паўнату, Міраслаў любіў зімой ездзіць на лыжах (хтосьці з парабкаў садзіўся на каня, а пан браў лейцы ў рукі і такім чынам ехаў ззаду за канём). Жонкі ў пана не было. У пана працавалі парабкі і наёмныя сяляне. Парабкі жылі неблага. Калі каму патрэбна была дапамога (адрамантаваць хату альбо прывесці ўрача) то Міраслаў, як правіла, выконваў гэтыя просьбы. Акрамя таго парабак атрымліваў 7 пудоў зерня, 120 пудоў бульбы, 12 пудоў асыпкі для кармлення жывёлы. Прывозіліся дровы. Карова парабка стаяла ў хлеве пана. Парабку патрэбна было накарміць і напаіць яе. Дзве каровы дазвалялася мець сталяру, кавалю, рымару (чалавек, які шыў збрую для коней), мельніку. Ад парабкаў патрабавалася дысцыпліна і акуратная работа. Калі парабак у чымсьці правініўся, то яму выдаваўся дакумент, па якому яго не ўсюды маглі ўзяць на працу. А так сям’я парабка заўсёды мела работу ў пана.

У пана Міраслава быў брат Людвіг, высокі з нармальным целаскладам, вясёлы і жыццярадасны чалавек. Пра яго жыццё вядома вельмі мала. Ён быў жанаты, але яго жонка загінула ў аўтакатастрофе на тэрыторыі Літвы, калі яны разам ехалі на ўласным аўтамабіле. Людвіг некаторы час жыў за мяжой. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна вяртаецца да Міраслава ў Гняздзілава. Аднак сядзібы брата ўжо не было. Восенню 1941 года партызаны (а хутчэй за ўсё людзі НКУС) баючыся, што немцы створаць тут гарнізон, спалілі сядзібу. Людвіг жыў у драўляным доме каля рэчкі побач з былўшай сядзібай. Але ў 1942 годзе партызаны забіваюць меншага пана, калі той ехаў праз Рулякоўскі лес у Докшыцы.

Аб Міраславе і яго браце Людвігу людзі адзываліся заўсёды добра. Гаварылі, што яны былі вельмі добразычлівыя і ўважлівыя да простых людзей. Пасля прыходу Савецкай улады Міраслава Слатвінскага арыштавалі на станцыі Параф’янава байцы Чырвонай Арміі і некуды звязлі. Пра далейшы лёс Міраслава і яго родных нам невядома.

- А што ж сабой уяўляла сядзіба пана Слатвінскага?

На месцы старой барочнай сядзібы ў 1-й палове XIX стагоддзя фарміруецца вялікая прыгожая сядзіба ў стылі класіцызму. Стары сядзібны дом быў параўнальна невялікі, але прыгожы. Паркавы фасад будынка меў мураваную тэрасу, на якую выходзілі 3 портэфенетры. Мелася тэраса з балюстрадай на паркавым





фасадзе. Пазней да яго прыбудоўваюцца бакавыя аб'ёмы з трохскатнымі дахамі, а да параднага фасада – плоскі аб'ём-тамбур, завершаны трохвугольным шчытом. Параўнальна вялікі палац, вядомы па фотаздымку 1894 года, заняў дамінуючае становішча ў сядзібе і быў апаясаны прыгожым вянком пасаджанага вечназялёнага самшыта. У палацы было некалькі рэпрэзентатыўных пакояў з прыгожым малюнкам паркету, белымі кафельнымі печамі, стыльнай мэбляй. Асабліва выдзяляліся галоўны хол, сталовая з дубовай абшыўкай сцен да вышыні 1,5 метра з круглым вялізным сталом і крэсламі, абітымі скураю, партрэтная зала, у якой меўся збор фамільных партрэтаў, у асноўным копій партрэтаў роду апошніх уладальнікаў Слатвінскіх. З боку парку быў вялікі салон з камінам, абстаўлены мэбляй у стылі Людовіка XV, абітай адамаскам. Да яго прылягаў меншы па памерах зялёны салон, абстаўлены мэбляй з магноліевага дрэва. Ён меў канапку незвычайнай формы (S-падобную) і фартэпіяна. Дом не захаваўся. На яго месцы зараз пабудаваны сушыльны ток.



У маёнтку была казарма, дзе жылі каля 20 салдат. Кіраваў атрадам капітан Сарока, а пазней – капітан Міхальскі. Ваенныя жылі ў канцы галоўнага будынка маёнтка, дзе размяшчалася канцылярыя і пакой для капітана.



З левага боку ад палаца размешчана афіцына. Будынак (захаваўся) вышэйшы за палац, параўнальна вялікі (28 на 14 м), цагляны і атынкаваны. Цэнтральная частка фасада вылучана неглыбокім рызалітам, які завяршаецца трохвугольным франтонам. Палац з афіцынай быў злучаны аранжарэяй. Акрамя гэтага ў пана была лядоўня, сыраварня, кузня, вядзяны млын, паравы млын, коні і асабісты аўтамабіль.

Паравы млын уяўляе сабой 2-х павярховы будынак. Тут рабілі муку і крупы. Пры млыне знаходзілася цыркулярка. А сталярка размяшчалася недалёка ад дома Слатвінскіх. Каля млына была пабудавана электрастанцыя. Таксама на тэрыторыі сядзібы, каля вадаёма, размяшчаўся драўляны магазін памерам прыкладна 5 на 6 метраў.



Што датычыцца параднага партэра сядзібы, то ён быў вялікі. Відаць, адпаведна пашырэнню памераў палаца змяняўся яго першапачатковы выгляд. У выніку ён мае цэнтральны традыцыйны круг, размешчаны на галоўнай восі (адпавядае пачатковаму сядзібнаму дому) і 2 бакавыя, сіметрычна размешчаныя адносна першага круга. На ім дажываюць 2 старыя ліпы са слядамі былой фармоўкі. Перад партэрам размешчаны вялікі вадаём, які візуальна пашырае паркавую прастору і

з'яўляецца акцэнтам перспектывы. Ён узнік пры перапланіроўцы сядзібы на галоўнай барочнай восі. Апошні ўладальнік Міраслаў Слатвінскі планаваў пабудаваць праз вадаём мост.

За палацам на плошчы 3 га размяшчаўся парк, які захаваўся ў сваіх былых межах і спалучае рысы барочнай рэгулярнай і новай пейзажнай планіроўкі. У цэнтры яго – фрагменты чатырох ліпавых алей былых баскетаў. Адна з алей размешчана на галоўнай восі, яна нешырокая (6 м), дрэвы пасаджаны праз 2 метры. Вось замыкаецца відавым штучным узгоркам, які меў вінтавую сцяжынку, што вяла да драўлянага стала.



*Козел-Паклёўская капліца раней і цяпер*



Паўднёвы баскет мае выразныя рысы планіроўкі: адзінкавыя ліпы, быццам калоны, стаяць сярод падросту з клёна, ліпы, ясеня. Ён служыў агародам, тут былі дом садоўніка з цэглы, сховішча яблыкаў. З усходняга боку размяшчаўся сад (вырошчваліся раннія гатункі яблыкаў). Паркавы выгляд баскету надавала альтанка з ліп да 10 метраў у дыяметры. Ліпы (захаваліся 17) нясуць сляды былой фармоўкі на вышыні 3 метраў. Дрэвы аднавілі кроны і ўтвараюць прыгожы шацёр. Супраць альтаны на ўскраіне былога баскета пад кронамі векавых ліп і клёнаў стаіць капліца Козел-Паклёўскіх, узведзеная ў неарэнесансных формах. У плане яна 8-гранная, складзена з бруса, мае гарызантальную абшыўку ўнутры і звонку. Завяршаецца прыгожым купалам з ліхтарыкам, які нагадвае ў мініяцюры купал касцёла ў Мядзелі. Крыпта капліцы складзена з валуноў і бута. Бутавая падпорная сценка складанай канфігурацыі (адпаведна граням капліцы) падкрэслівае невялічкі пагост. На ім былі пахаваны прадстаўнікі роду Шышкаў (захаваліся адзінкавыя надмагільныя пліты).

Да парку прымыкалі сады. Паўднёвы сад, які ахоплены радамі ліп, вымерз у суровую зіму 1939-40 гадоў. Другі сад плошчай 5 га, займаючы паўночна-заходнюю частку сядзібы, быў агароджаны і абсаджаны бярозамі.

У сядзібу вялі тры алеі. Заходняя, ўязная, была галоўнай. Уезд фіксаваўся брамай з невялічкай вартоўняй. Захаваліся два цагляныя атынкаваныя масіўныя пілоны з вузкімі гатычнай формы праёмамі для праходу і глыбокімі паўцыркульнымі бакавымі нішамі. Пары сферычных ніш імітуюць байніцы, а завяршэнне пілонаў зубчатае на манер крапасных сцен. Ад брамы ішла бакавая



дарога ў гаспадарчы двор. Тут меліся 2 кароўнікі на 120 галоў (разводзілі племянных чырванапольскіх кароў), цялятнік, канюшня, свіран. Сядзіба мела гумнішча (характэрны элемент рэнесансных сядзіб), спланаванае ў выглядзе

прамавугольніка, агароджанае ўязной брамай. Яе вялізныя пілоны былі вырваны ў 1966 годзе.

- Вось і закончылася наша “падарожжа”. Але перш чым развітацца з вёскай Гняздзілава мы, па традыцыі, рашым зноў невялічкі красворд.

1. Якім дрэвам быў абсаджаны палац Слатвінскага?
2. Што знаходзілася ў пабудове, якая размяшчалася каля млына?
3. Як звалі апошняга ўладара Гняздзілаўскага маёнтка?
4. Якая пабудова была размешчана каля ўязной брамы?
5. Якія пароды кароў разводзілі ў кароўніку Слатвінскіх?
6. Як называлася вёска ў час яе першага ўпамінання ў летапісу?
7. Чым былі злучаны паміж сабой палац і афіцына?
8. У якім стылі была пабудавана новая сядзіба ў Гняздзілаве?
9. Чым была абіта мэбля ў адным з пакояў палаца Слатвінскіх?
10. Прадстаўнікі якога роду былі пахаваны ў капліцы?
11. З якога дрэва была зроблена мэбля ў зялёным пакоі палаца?

| | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | **1.** | **С** | а | м | ш | ы | т | | | | | | |
| | | **2.** | Ц | ы | р | к | у | **Л** | я | р | к | а | | | | | | | |
| | | | | **3.** | М | і | р | **А** | с | л | а | ў | | | | | | | |
| | | | | **4.** | В | а | р | **Т** | о | ў | н | я | | | | | | | |
| | | | | **5.** | Ч | ы | р | **В** | о | н | а | п | о | л | ь | с | к | а | я |
| | **6.** | Г | н | я | з | д | з | **І** | л | а | в | і | ч | ы | | | | | |
| | | | | **7.** | А | р | а | **Н** | ж | а | р | э | я | | | | | | |
| | | | | **8.** | К | л | а | **С** | і | ц | ы | з | м | | | | | | |
| | **9.** | А | д | а | м | а | с | **К** | | | | | | | | | | | |
| | | | **10.** | Ш | ы | ш | к | **І** | | | | | | | | | | | |
| **11.** | М | а | г | н | о | л | і | **Я** | | | | | | | | | | | |

- Пасля любога праведзенага паходу турысты звычайна складаюць справаздачу. Мы таксама не будзем адыходзіць ад гэтага правіла. Але справаздача наша будзе крыху незвычайная. Нам патрэбна будзе раздзяліцца на чатыры групы. Кожная група атрымлівае заданне – даць характарыстыку адной вёсцы, праз якую пралягаў наш маршрут па прыведзенаму ў табліцы плану. Напрыклад, першай групе неабходна даць характарыстыку вёсцы Кіякова, другой – вёсцы Сітцы, і гэдак далей. Такім чынам мы потым і запоўнім усе графы прапанаванай табліцы.

| Назва вёскі | Час пабудовы, (рэканструкцыі) | Уладальнік | Стыль пабудовы | Склад сядзібы | Што захавалася, або часткова захавалася |
|---|---|---|---|---|---|
| Кіякова | Канец XIX – пачатак XX стагоддзя | Паны Кіякоўскія | Мела рысы ўтылітарнай мэтазгоднасці | Палац, афіцына, свіран, кузня, лядоўня, вяндлярня, піўніца, стайня, ферма, капліца, пейзажны парк | Дрэвы былога пейзажнага парку, стайня, ферма, свіран, лядоўня, капліца. |
| Сітцы | II палова XVIII стагоддзя | Бжастоўскія | Барока | Брама з агароджай, кашара, палац, аранжарэя, дом агароднiка, вяндлярня, скляпенні, жылыя дамы, капліца, пейзажны парк, водная сістэма. | Брама з агароджай, кашара, рэшткі пейзажнага парку, 4 пілоны параднага фасада, фрагменты скляпенняў, водная сістэма, дуб, вяндлярня. |
| | Пачатак XIX стагоддзя | Аляксандр Дамейка | Пераходны да класіцызму | | |
| | Канец XIX – пачатак XX ст | Вацлаў Дамейка | | | |
| Бярозаўка | XIX стагоддзе | Свентаржэцкія | Будавалася ў некалькі этапаў. У апошні час набыла эклектычныя рысы. | Палац, бровар, капліца, гаспадарчы двор, парк, сад, ліпавыя алеі, водная сістэма. | Вадаёмы, бровар (млын), капліца, усходняя алея, дрэвы пейзажнага парку і сада. |
| Гняздзілава | Пачатак XVIII стагоддзя | Рудаміны-Дусяцкія | Барока | Сядзібны дом, казарма, канцэлярыя, афіцына, аранжарэя, лядоўня, сыраварня, кузня, вадзяны млын, паравы млын, цыркулярка, сталярка, электрастанцыя, магазін капліца, брама з вартоўняй, агароджа, 2 кароўнікі, цялятнік, канюшня, свіран, гумнішча, пейзажны парк. | Афіцына, фрагменты дрэвастою былога пейзажнага парку, капліца, брама, вадаём на мясцовым вадатоку. |
| | I палова XIX стагоддзя | Слатвінскія | Класіцызм | | |

# *Сядзібава-паркавыя ансамблі Докшыччыны*

(Практычная частка)

**Мэта:**

Знаёмства з гістарычнымі і прыроднымі асаблівасцямі сядзібава-паркавых ансамбляў Докшыцкага раёна.

**Задачы:**

- Наведаць месцы, дзе захаваліся рэшткі панскіх сядзіб.
- Сабраць звесткі пра жыццёвы шлях уладальнікаў сядзіб у вёсках Кіякова, Сітцы, Бярозаўка, Гняздзілава.
- Пазнаёміцца з культавымі пабудовамі Докшыцкага раёна.
- Пазнаць прыгажосць роднага краю.
- Удасканаленне турысцкіх навыкаў.

Наша падарожжа праходзіла па цікавых мясцінах Докшыцкага краю. Таму яшчэ пры падрыхтоўцы да паходу была запланавана работа па вывучэнню гэтай мясцовасці.

На тэрыторыі, праз якую пралягаў наш маршрут, знаходзіцца шмат прыродных, культурных, культавых помнікаў, а таксама помнікаў і памятных месц, звязаных з гістарычнай барацьбой беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Асабліва нас цікавіў сучасны стан былых панскіх сядзіб. Пагэтаму мы стараліся, згодна з задачамі паходу, наведаць гэтыя аб’екты, даць ім апісанне і, па магчымасці, сфатаграфаваць іх.

У час паходу таксама праводзіліся назіранні за станам навакольнага асяроддзя. У паходзе на маршрутнай карце адзначаліся ландшафты, праз якія даводзілася праходзіць турыстам. Была састаўлена табліца гістарычных помнікаў на нітцы маршрута. Пасля заканчэння падарожжа сабраная інфармацыя была апрацавана і выкарыстана для напісання справаздачы аб паходзе. Справаздача была напісана ў выглядзе дзённіка. Уся асноўная інфармацыя змяшчаецца ў дадатковым зборніку, які змешчаны на старонках гэтай справаздачы.

# *Прыкладны парадак праходжання маршрута*




Адпраўным пунктам нашага падарожжа па вывучэнню помнікаў сядзібава-паркавага мастацтва Докшыцкага раёна мы выбралі горад Докшыцы. Аўтобусам “Докшыцы – Вешняе” экспедыцыйная група ў 6:00 выязджае да вёскі Грабучае. Ад Грабучага неабходна накіравацца на захад. Прайшоўшы каля 6 кіламетраў па грунтовай дарозе праз вёскі Макаравічы і Чаркасы, група выйдзе да населеннага пункта Кіякова.

Зараз гэта невялічкая вёсачка, дзе пражывае каля 35 чалавек. Назва хутчэй за усё паходзіць ад Аляксандра Кіякоўскага, які валодаў гэтай вёскай у канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў. Менавіта Кіякоўскія і заклалі на рубяжы стагоддзяў параўнальна вялікую сядзібу, якая мела рысы ўтылітарнай мэтазгоднасці. З часоў эклектыкі яна захавалася лепш за ўсе. Уключала палац з афіцынай, свіран, лядоўню, вяндлярню, кузню, піўніцу, парк, сад і вялізны гаспадарскі двор. У вёсцы, акрамя таго, мелася 2 дамы для рабочых (на 12 сем’яў).

Далей група накіроўваецца на поўдзень. Мінае вёскі Лісавічы і Старое Сяло і праз 9 кіламетраў трапляе ў вёску Сітцы. Гэта адно з самых старажытных паселішч Докшыцкага раёна.

Рухаючыся па вёсцы з паўночнага боку, можна назіраць прыгожую праваслаўную царкву. Першая праваслаўная царква ў Сітцах была пабудавана ў 1710 годзе, але пазней скасавана. Паўторна была пабудавана прыхаджанамі ў 1819 годзе, а ў 1903 годзе з-за лядаштасці разабрана. Новую каменную, неатынкаваную царкву залажылі ў 1910 годзе на добраахвотныя ахвяраванні прыхаджан, братэрства царквы Гасудар-Імператара Мікалая II, намаганнямі святара Яўстафія Нядзельскага і іншых дабрачынцаў. Асвяцілі царкву ў 1913 годзе. Прастол у царкве адзін – у імя Святога Вялікапакутніка і Пераможца Георгія. Мясцовыя жыхары ганарацца тым, што сітцаўская царква з дня свайго асвяшчэння і па сённяшні дзень не зачынялася. У 2000 годзе адбылася рэстаўрацыя фрэсак царквы мастаком.



У цэлым жа гісторыя праваслаўя ў Сітцах багатая і насычана падзеямі і памятнымі датамі. Напрыклад, у ведамасці за 1825 год сцвярджаецца, што ў сітцаўскай царкве маецца архіў і царкоўная бібліятэка. Тут захоўваецца 280 тамоў кніг, сярод якіх ёсць вельмі каштоўныя і даўнія. Таму ўваход у бібліятэку строга абмежаваны. Ушаноўваецца ў царкве і ікона Прападобнага Айца Серафіма Хароўскага.

Пабываўшы ў Сітцах, Пятрусь Броўка прысвяціў дубу верш “Балада пра дуб саўгаса “Сітцы”, у аснову якога ляглі падзеі, што адбыліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Шмат за жыццё дзівоснага
Бачыць мне выпадала,
Дрэваў самых магутных
Я наглядаў нямала.
Бачыў у пушчах дрымотных,
Каля азёраў, крыніцаў...
Чаму ж ты параніў сэрца,
Дуб, што з саўгаса “Сітца”?
Год мо пяцьсот ці болей.
Аж да аблокаў рушыш,
Крокаў аж дваццаць зробіш,
Пакуль ля камля абкружыш.
Галлё тваё, што крэмень,
Летам мядзяна-зялёны...
Ды на цябе як гляну,
Быццам ты чым засмучоны?..
І праўда, калі распазнаеш,
Хочацца слёзам ліцца,
Што мне пра дуб расказалі
Людзі з саўгаса “Сітца”.
Глянь жа ты ўвысь і добра,-
Вершаліна дуба свіціцца,
Бачыш зялёную крону,
Абскуб яе нехта быццам?
Ўто ж па галлі пахадзілі
Сякерамі, нават пілою –
Гэта было ў сорак першым,
Часінаю вельмі цяжкою.
Гэта было ў сорак першым,
У год невыносна-крывавы.
Эсэсаўцам, выродкам лютым,
Бач, не хапала забавы,
Ну й рагаталі ж, як чэрці,
З выдумкі быццам заўзятай,
Сагналі музыкаў палонных
У робах сюды паласатых.
Што ім бяда музыкантаў.
Затое эсэсаўцам люба –
Ах, як іграў ім, іграў ім
Аркестр духавы на дубе!..
Былі сярод тых аркестрантаў
Савецкія, сербы, французы,
Бельгійцы, англійцы, ірландцы –
Іграліся вальсы і блюзы,
Ігралі ваўсю аркестранты,
Заказы ім з долу крычалі,
А каты ў мундзірах, спадніцах,
Скакалі, скакалі, скакалі...
Да сёмага поту скакалі,
Як толькі трымалі іх ногі,
Здавалася – неба ірвалі
Пра фюрэра “хайлі” і “гохі”...
І раптам яны анямелі
І знік звар’яцелы запал,
Ім вушы прарэзаў няшчадна,
Як гром, як нястрымны абвал,-
“Інтэрнацыянал”!..
Эсэсаўцы гаўкалі: - Стой!..
Але аркестранты не чулі –
Ігралі мацней і мацней...
І з долу пасыпалі кулі!
Ды марш пралетарскі байцоў
Ніякая смерць не заглушыць.
І падалі з голля тады
Нічым не скаронныя душы.
Ім бачыўся час перамог,
І горда яны паміралі,
А трубы і нават адны,
Здавалася, самі ігралі...

***

А мне ўсё гэта расказаў,
Ніколі аб тым не забыцца,
Волат наш, сведка жывы,
Дуб, што ў саўгасе “Сітца”!

Зараз цяжка ўявіць, што адна з самых старажытных вёсак раёна, біяграфія якой налічвае некалькі стагоддзяў, была некалі найпрыгажэйшым месцам у наваколлі. Вядомы ў краіне парк з гістарычным дубам, колішні ўзор садова-паркавага мастацтва, стаў узорам таго, як “цяперашнія гаспадары” у адзін час разбурылі тое, што стваралася стагоддзямі. Не так даўно ў 2002 годзе па рашэнню ЮНЭСКА цэлы год свет прысвяціў памяці знакамітага беларуса, вядомага даследчыка, геолага, прафесара мінералогіі, у гонар якога названы мінерал “дамекіт”, Ігната Дамейкі. Праўда, у другой палове жыцця, пасля паражэння нацыянальна-вызваленчых паўстанняў супраць Расіі, ён, актыўны іх удзельнік, знайшоў сабе прытулак у Чылі і ўжо там пачаў займацца навукай. Але гасцінная чылійская зямля, дзе Дамейка быў прызнаны геніем яшчэ пры жыцці, не замяніла яму радзімы. Пра Беларусь ён памятаў і заставаўся беларусам-ліцвінам да канца свайго жыцця. Сёння Беларусь па праву ганарыцца сваім сусветна вядомым сынам і аднаўляе па крупіцы ўсё тое, што звязана з ім на зямлі, якая яго нарадзіла.

Якім жа непараўнальным было здіўленне дэпутатаў Сітцаўскага сельскага Савета, калі на адной з сесій настаўніца гісторыі мясцовай школы (а з 2007 года яшчэ і кіраўнік аб’яднання па інтарэсах “Юныя краязнаўцы” Дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі “Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі”) Тамара Тадэвушаўна Каляга расказала ім, што былы сітцаўскі пан з рода Дамейкаў. У 1798 годзе ўладальнікам маёнтка стаў Тадэвуш Дамейка – родны дзядзька Ігната Дамейкі. У 1829 годзе яго ўладальнікам стаў Аляксандр Дамейка, стрыечны брат Ігната. І хто ведае, магчыма пазней прыязджаў да брата на госці Ігнат.

Па словах Тамары Тадэвушаўны – чалавек, як і дрэва, не можа існаваць без сваіх каранёў. Нерадасныя вынікі падобнага жыцця мы ўжо маем. Немагчыма стварыць нешта істотнае на пустым месцы, не заўважаючы, што тут было раней. Паглядзіце, за паўстагоддзя нашчадкі не толькі не здолелі стварыць нічога лепшага, чым быў маёнтак, а наадварот, сметнік стала нагадваць найпрыгажэйшае месца. Таму, пакуль не позна, пакуль яшчэ хоць нешта засталося ад мінуўшчыны, якую, дарэчы, ва ўсім свеце з замілаваннем захоўваюць, трэба ратаваць усё гэта, памятаючы, што маёнтак будавалі нашы прадзеды. Прозвішчы некаторых з гэтых майстроў яшчэ захаваліся на каменных слупах агароджы.

Штуршком да той вялікай пошукавай работы, якую ўжо сёння зрабіла настаўніца са сваімі памочнікамі і вучнямі, паслужыў прыезд у Сітцы ў 1998 годзе нашчадка роду Дамейкаў Марыуша Германаваіча, які зараз жыве ў Францыі. Яго маці маленькай дзяўчынкай вывезлі ў 1939 годзе з Сітцаў. Ён ніколі не бачыў радзімы продкаў, але жывучы за мяжой, збірае ўсе звесткі, якія датычацца рода. Маці расказала яму пра маёнтак, тых сялян, што ў ім працавалі. І ён прыехаў, каб адшукаць іх нашчадкаў, пабачыць радавое гняздо. І здівіўся:

- Ну, што за няўмекі! Да чаго такі парк давялі!

Тамару Тадэвушаўну радуе, што яе намаганні не прападаюць дарэмна і сёняшняе пакаленне – не толькі той саўгасны трактарыст, што зламаў трактарам цэлы пралёт у агароджы парка, але і члены яе гісторыка-краязнаўчага гуртка. З Германавічам яна не сустрэлася, бо пра яго прыезд даведалася пазней. Але потым завязалася перапіска, і не толькі з ім, але і яшчэ з шэрагам людзей з розных месц, адкуль паступілі гістарычныя дадзеныя аб сітцаўскім маёнтку і парку. Зараз гэтых матэрыялаў дастаткова, каб адкрыць нават невялічкі музей. Але ж галоўны клопат усё ж такі аб парку, аб гэтым помніку – жамчужыне XVII стагоддзя, з якім так няўдзячна паступілі нашчадкі. Тамара Тадэвушаўна па артыкулу ў газеце адшукала Анатоля Тарасавіча Федарчука, выкладчыка ўніверсітэта, эколага, які бярэцца на прафесійнай аснове аднавіць парк.

Адной энтузіястцы падобная справа, канечне, не пад сілу. Патрэбна дапамога не толькі сельскага Савета, але і раённых структур, раённай інспекцыі па прыродных рэсурсах і ахове навакольнага асяроддзя і іншых. Сёлетні год клопатамі Прэзідэнта, урадавых структур аб’яўлены годам Роднай Зямлі. Аднаўленне сітцаўскага парка магло б стаць самай прыкметнай з’явай гэтай дзяржаўнай акцыі ў межах раёна.

Пасля экскурсіі далейшы шлях праходзіць у паўднёвым накірунку да аўтадарогі Докшыцы – Ваўкалаты. Па ёй неабходна прайсці ва ўсходнім накірунку каля двух кіламетраў. Тут нам трапіцца вёска Рапяхі. Каля дарогі знаходзяцца мясцовыя могілкі. На іх можна знайсці магілы, дзе пахаваны Тадэвуш Дамейка, яго сын Аляксандр і нявестка Соф’я. Мясцовыя жыхары даглядаюць іх. Па іх словах, у 1930-я гады, калі гаспадаром маёнтка ў Сітцах быў Вацлаў Дамейка, жыў у Рапяхах адзін хітры мужык. Як толькі заўважыць здалёк карэту Вацлава, то адразу спашаецца на могілкі. Плача, успамінае, якія добрыя ласкавыя былі тыя, што тут пахаваны. Пан, разжалабіўшыся ад такога, шчодра адорваў селяніна. Аб хітрасці мужыка ён здагадваўся, бо гэта паўтаралася не раз, аднак грошы не шкадаваў.



*Магілы Дамейкаў у Рапяхах*

За Рапяхамі ў прыгожым сасновым лесе можна спыніцца на начлег. Калі ж надвор’е неспрыяльнае, прыпынак на начлег лепш зрабіць у Сітцаўскай сярэдняй школе.

На наступны дзень група рухаецца далей на ўсход. Мінае мост праз раку Галядза (зараз ёй вярнулі гістарычную назву – Балядка) і трапляе ў вёску Параф’янава. Яна вядома з сярэдзіны XVI ст. як сядзіба ў Віленскім ваяводстве Вялікага княства Літоўскага, потым у Рэчы Паспалітай. У розныя часы належала каталіцкай царкве, Пшадзецкім, Тышкевічам. У 1886 годзе ўпамінаецца як мястэчка або сядзіба. Па адной з легенд – ад Глыбоцкай,

Докшыцкай і Валкалацкай парафій былі аддзелены землі новай парафіі. На гэтых землях быў пабудаваны касцёл. Таму лічаць, што назва вёскі Параф'янава пайшла ад слоў "Парафія нова".

Аднак існуе і другая версія назвы вёскі, якую запісалі юныя краязнаўцы Параф'янаўскай СШ са слоў Маслоўскай Яніны Браніславаўны і Вайцяховіч Арсенія Рыгоравіча.

*...Гадоў сто, а можа і дзвесце назад у гэтай мясцовасці жылі прыгажуня Яна і каваль-асілак Парфен. Яны моцна кахалі адзін аднаго. Дзяўчыне ішоў толькі 16 год. Яшчэ, здаецца, учора была падлетак, гарэза. А ў гэта лета стала ў самай пары дзяўчына, у самай красе. Калі толькі вырасла. І для іх гэта лета стала летам іх першага кахання. Але так не бывае, каб усё добра было. Калі навокал прыгожа, а на сэрцы радасна, дык абавязкова бяда зусім блізка. Бяды не здарылася б, каб не краса дзяўчыны.*

*Аднойчы ў Купальскую ноч пайшлі Парфен і Яна на Лысую гару шукаць папараць кветку і заблудзіліся. Доўга блукалі яны па лесе. Стаміліся. Парфен прапанаваў Яне пасядзець каля ясеня і адпачыць, а сам у гэты час пайшоў шукаць дарогу дадому. Тут раптам з-пад ясеня паказалася рука нячысціка, а голас яго зваў Яну да сябе ў карагод. Як заварожаная Яна падала руку, і невядомая сіла пацягнула яе да сябе.*

*- Парфен, ратуй мяне!*

*Пачуў гэта Парфен і хуценька прыбег да ясеня, дзе аставіў сваю каханую. Бачыць, што нячыстая сіла Яну да сябе цягне, раззлаваўся ды сам выцягнуў пачварыну з-пад дрэва. Узмаліўся нячысцік, прасіцца стаў. Золота, брыльянты прапаноўваў. Ды не згадзіўся Парфен, а ўзяў і ўтапіў нячыстую сілу ў балоце.*

*Сталі яны выбірацца з дрымучага лесу, ды ніяк не могуць. Але тут на небе з'явіўся нейкі агеньчык. Вырашылі яны пайсці на гэты агеньчык і не прайшлі з дзесятак крокаў, як замест багны і лесу раптам адкрылася чыстае месца. І тут каваль-асілак праз некаторы час заклаў падмурак каплічкі. А ад імёнаў Парфен і Яна, напэўна, і ўзнікла назва вёскі.*

На левым беразе ракі Галядза знаходзіцца велічны касцёл Найсвяцейшай Дзевы Марыі. Першая яго фундацыя ажыццёўлена ў 1630 годзе Мельхіёрам Гіляшкевічам, архідыяканам віленскім. У 1908 годзе на сродкі парафіян і намаганнямі ксяндза Б.Корна пачалося будаўніцтва мураванага касцёла, у асноўным завершанае да 1913 года. Аднак святыня была кансекравана толькі ў 1931 годзе арцыбіскупам Р.Ялбржыкоўскім. Гэты помнік архітэктуры псеўдабарока яшчэ больш выразна імітуе пашыраную ў часы барока 2-вежавую базіліку з трансептам. Сцены цалкам змураваны з цэглы і атынкаваны. Фасады ажыўляе багатая ордэрная пластыка: прафіляваныя карнізы, пілястры, вялікія і разнастайныя па форме аб'ёмы. Унутры цэнтральны неф перакрыты



цыліндрычным скляпеннем з распалубкамі, бакавыя нефы – крыжовымі. Слупы і сцены расчлянёны падвойнымі пілястрамі і ўпрыгожаны арнаментальным роспісам і гіпсавымі гарэльефамі на тэму “Крыжовы шлях Хрыста”, выкананымі ў 1927 годзе. У 1956 годзе касцёл у вёсцы Параф’янава быў закрыты і прыстасаваны пад склад. З 1989 года вернуты каталіцкай парафіі і дзейнічае да гэтага часу.

Побач з касцёлам знаходзіцца спіртзавод. А калісьці на гэтым месцы знаходзілася сядзіба. У 40-я гады XIX стагоддзя яна належыла роду Шышкаў. Мелася ў гэты час усяго 4 дваровых, прыгонных было 154 (40 сялянскіх двароў), якія мелі аднолькавыя з сялянамі Гарадзілава павіннасці. У цяперашні час ад сядзібы захаваўся добраўпарадкаваны бровар (1880) і адзінкавыя дрэвы ўязной алеі. У 1928 годзе, калі мясцовыя ўлады ніяк не маглі знайсці грошы на ўзвядзенне Параф’янаўскай сямігадовай школы (на самай справе яна размяшчалася ў Заборцах на месцы сённяшняга школьнага стадыёна), Вацлаў Дамейка (уладальнік маёнтка ў Сітцах) дапамог з гэтай справай. Ён даў лесу на будоўлю і даў школе 12 гектараў зямлі. Вядома, што вялікі глінабітны будынак на скрыжаванні дарог у Заборцах, дзе ў 1930-я гады жылі настаўнікі, у 1921 годзе быў ва ўласнасці Дамейкаў. Аднак невядома, ці быў ён перададзены Дамейкам бясплатна, ці ўсё ж яго выкупілі тагачасныя мясцовыя ўлады. На жаль, гэты будынак, пад час прыезду ў Янукі прэм’ер-міністра Украіны Віктара Януковіча, быў знесены.

З Параф’янава трэба павярнуць на поўдзень у накірунку вёсак Целяшы і Паляне, мяжой паміж каторымі з’яўляецца рака Зуйка. Праўда, цяпер ракой яе можна назваць умоўна. А раней гэта была паўнаводная рака, пра якую нават ходзяць легенды. Вось адна з іх:

*...Калісьці даўным-даўно жыў у гэтых мясцінах жорсткі пан. Ніхто не меў ад яго міласці. А яшчэ была прыгожая дзяўчына. Пакахаў яе дужы юнак Мікола. Радаваліся людзі, гледзячы на іх. Але нядоўга было шчасце закаханых. Напаткаў дзяўчыну пан, спадабалася яна яму. Вось і вырашыў ён забраць дзяўчыну да сябе ў маёнтак на пацеху. Прыехалі панскія цівуны за красуняй, а яна кінулася да свайго Міколы за дапамогай. Пачалі яны ўцякаць. Дабеглі да рэчкі. Мікола кінуўся ў ваду і паплыў, а дзяўчына спалохалася і пабегла па беразе. Панскія служкі, здаецца, вось-вось дагоняць яе. Упала дзяўчына на калені і пачала прасіць літасці ў неба. Адбыўся цуд. Вось ужо рукі даганятых дакрануцца да дзявочых кос... Як раптам яна ператварылася ў маленькую птушачку зуйку і паляцела за рэчку.*

*Мікола ж выйшаў на бераг, азірнуўся, а яго любай нідзе няма. Ад гора на вачах у стражнікаў ён пачаў ператварацца ў высокі разложысты дуб. А людзі ў памяць аб дзяўчыне і назвалі рэчку – Зуйка.*

Ад Палянь па гравейнай дарозе рухаемся далей на поўдзень яшчэ каля 4 кіламетраў да вёскі Дзегцяры. Ад Дзегцяроў па асфальтаванай дарозе праз 3 кіламетры выйдзеце на аўтадарогу Докшыцы – Вілейка, перасякаеце яе і праз

кіламетр увойдзеце ў вёску Бярозаўка. У 1886 годзе яна ўпамінаецца як сядзіба Параф'янаўскай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні.

Вёска Бярозаўка, безумоўна, адно з прыгажэйшых паселішчаў у нашым раёне. Некаторыя яе жыхары сцвярджаюць, што тут нават у паветры прысутнічае нейкая асаблівая аўра прыгажосці і вытанчанасці. Гэтую асаблівасць заўважылі некалі і Свентаржэцкія, якія першымі пабудавалі тут маёнтак. Менавіта яны пасадзілі тут сад і тую знакамітую алею, якія і сёння з'яўляюцца сапраўдным упрыгажэннем вёскі, як і бровар, які захаваўся, і азярцо перад ім. Нядаўна ў адміністратыўным будынку былога калгаса пабудаваны касцёл, які яшчэ больш упрыгожыў гэту цудоўную панараму. Праўда, бязмежна запушчаную, якая выклікае бязрадасныя думкі аб тым, што лёгка разбурыць прыгажосць і цяжка стварыць на яе месцы нешта іншае, не менш годнае. Мяркуючы па рэальнасці, фантазіі хапала толькі на будаўніцтва мехдвароў, жывёлагадоўчых ферм – ды яшчэ насупраць былых маёнткаў, храмаў. Хаця гэта былі найпрыгажэйшыя месцы ў любой мясцовасці. Не стала выключэннем і Бярозаўка.



***Касцёл у Бярозаўцы***

Бывала, едзеш па яе галоўнай і практычна адзінай вуліцы міма азярца і алеі, і толькі ўздыхаеш, гледзячы на хмызняк, кусты, што ўсё запаланілі. Але вось аднойчы восенню 2005 года самыя неабыякавыя мясцовыя жыхары арганізаваліся, узялі ў рукі пілы, тапары і выйшлі на працу. Цэлы дзень яны зразалі старыя, засохшыя дрэвы, высякалі гмызняк, стоячы часцяком па пояс у азёрнай вадзе. Потым усё гэта звезлі, і азярцо "адкрыла" вочы. Дзіўна, але большасць вяскоўцаў не выказала аніякай зацікаўленасці да таго, што адбываецца і ўжо тым больш не прапанавала дапамогі. Знаходзіліся і такія, каму гэты буралом, аказваецца, зусім не перашкаджаў.

Канечне, зроблена толькі невялічкая частка таго, што даўно напрошвалася, але бярозаўцы думаюць працягнуць расчыстку далей, а там возьмуцца за будаўніцтва зоны адпачынку з альтанкай, клумбамі. Ксёндз докшыцкага касцёла Святой Тройцы Марэк Пасют наогул марыць аб рэстаўрацыі бровара і стварэнні адзінага прыродна-гістарычнага ансамбля. Здзяйсненне апошняга – далёкая будучыня, а вось зона адпачынку – гэта больш рэальнае і магчымае. Толькі ці хопіць у кучкі энтузіястаў запалу і жадання, калі іх ініцыятыва не будзе падтрымана?



За Бярозаўкай неабходна накіравацца на паўночны ўсход, каб выйсці да вёскі Селішча. Каля Селішча на беразе ракі Поня можна спыніцца на начлег. Пры добрым надвор'і можна зрабіць невялікую экскурсію ў вёску Буй. У 2007-08 гадах у Буі сталі распрацоўваць пясчаны кар'ер. У выніку гэтага тут была знойдзена нібыта нейкая сцяна з праходам у выглядзе аркі. Бачна, што сцяна складзена з цэглы. На жаль, ніякіх раскопак тут не праводзілі.

Пры неспрыяльным надвор’і спыніцца на начлег можна ў Бярозаўскай сярэдняй школе.

На трэці дзень падарожжа група накіроўваецца далей на паўночны ўсход і праз 4 кіламетры выходзіць да вёскі Гняздзілава. Яна ўзнікла не пазней XIV стагоддзя на тэрыторыі ўладанняў Манівідаў у старажытнай Харэцкай воласці. Упершыню бортнікі “няздзілавічы” (“nezdylowycy”) упамінаюцца ў пацвярджальнай грамаце вялікага князя Вялікага княства Літоўскага Вітаўта, выдадзенай 13 студзеня 1407 года віленскаму ваяводзе Войцеху Манівіду. У далейшым адна з частак Харэцкай воласці перайшла ад Манівідаў да іх сваяка Алехны Судзімонтавіча, потым да яго зяця Станіслава Барташэвіча Мантоўта, другая – да Радзівілаў. У абедзьве часткі ўваходзіла пэўная колькасць сялян-даннікаў з Гняздзілавіч.

У 1567 годзе Гняздзілавічы згадваюцца сярод маёнткаў М.Ю. Радзівіла Рудога, які ў 1570 годзе здаваў іх у “заставу” (заклад) В. Тышкевічу. Радзівілаўская частка Гняздзілавіч была далучана да маёнтка Жупраны ў Ашмянскім павеце. У пачатку XVIII стагоддзя Гняздзілавічы належалі Рудамінам-Дусяцкім, якія і заклалі тут сядзібу і парк. Ад Рудамінаў Гняздзілавічы закладзены кляштару кармелітаў у Глыбокім. Уваходзілі ў Ашмянскі павет Віленскага ваяводства. У 1793 годзе адыйшлі да Расійскай Імперыі, а ў 1882 годзе маёнтак Гняздзілава быў узяты ў дзяржаўны скарб, і ў канцы XIX стагоддзя перайшоў ва ўласнасць Козел-Паклёўскіх, потым – Слатвінскіх.



З Гняздзілава дабрацца да горада Докшыцы можна рознымі шляхамі. Можна выбраць самы лёгкі. Гэта аўтобусам “Докшыцы – Куты” у 15:00 альбо ў 17:55. Можна прайсці па старой дарозе кіламетраў 7. Але тут вы нічога цікавага не ўбачыце. Мы ж прапануем трэці варыянт. Група павінна выйсці да машыннага двара СПК “Гняздзілаўскі” і накіравацца на поўнач. Вы пройдзеце па прыгожай бярозавай алеі, праз невялічкую вёсачку Жары, а праз кіламетры 4 трапіце на ўскраіну вёскі Валасатка. Цяпер гэта вёска нежылая. Але ў яе паўночнай частцы вы знойдзеце капліцу. Гэты помнік драўлянага дойлідства пабудаваны ў 1848 годзе. Уяўляе сабой невялікае 6-граннае збудаванне з драўлянага бруса, каркаснай канструкцыі. Аснова капліцы – невысокі зруб, устаноўлены на валунах. Завершана капліца невысокім гонтавым шатром з макаўкай. У інтэр’еры ўстаноўлена скульптура XVIII стагоддзя “Укрыжаванне з





перадстаячымі", выкананая народнымі майстрамі. У цэнтры кампазіцыі ўкрыжаваны Хрыстос, а па баках ад яго Дзева Марыя і Іаан Прадцеча. Па народнаму павер'ю капліцу пабудавалі пасля таго, як у гэтай мясцовасці адбыўся мор. Многа людзей памірала. Ніякія лекі не дапамагалі. Пасля таго, як людзі пабудавалі капліцу і сталі тут маліцца, невядомая хвароба адступіла.

Праз кіламетры тры група выйдзе да кальцавой дарогі.

## Прапануемы графік руху

| Дзень | Участкі пераходаў | Адлегласць км | Спосаб руху |
|---|---|---|---|
| 1 | г. Докшыцы - в. Грабучае | 20 | аўтобус |
| | в. Грабучае - в. Кіякова | 7 | пешшу |
| | в. Кіякова - в. Сітцы | 9 | пешшу |
| 2 | в. Сітцы - в. Заборцы | 4 | пешшу |
| | в. Заборцы - ст. Параф'янава | 2 | пешшу |
| | ст. Параф'янава - в. Паляне | 3 | пешшу |
| | в. Паляне - в. Дзегцяры | 4 | пешшу |
| | в. Дзегцяры - в. Бярозаўка | 4 | пешшу |
| | в. Бярозаўка - в. Селішча | 5 | пешшу |
| 3 | в. Селішча - в. Гняздзілава | 4 | пешшу |
| | в. Гняздзілава - в. Валасатка (неж.) | 7 | пешшу |
| | в. Валасатка - г. Докшыцы | 4 | пешшу |

***Усяго актыўным спосабам руху – 53 км.***

# Карта падарожжа



# *Літаратура*


1. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Мінск: БелЭн, 1996-2003.
2. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць – Мінск: Бел. Сав. Энцыклапедыя, 1985. – С.242 – 258.
3. Их именами названы…: Энциклопедический справочник. – Мінск: БелСЭ, 1987. – 711 с.
4. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: БелЭн, 1993-2003.
5. Газета "Родныя вытокі". – 2008 – 2012.
6. Кулагін, А.М. Каталіцкія храмы на Беларусі: Энцыклапедычны даведнік /А.М. Кулагін – Мінск: БелЭн, 2000.
7. Кулагін, А.М. Праваслаўныя храмы на Беларусі: Энцыклапедычны даведнік / А.М.Кулагін – Мінск: БелЭн, 2001. – 328 с.
8. Легенды і паданні Докшыцкага краю. – Докшыцы, ЦДТ, 2001. – 68 с.
9. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Докшыцкага раёна: рэд.кал.: Г.П.Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭН, 2004. – 752 с.
10. Шуневка. Мінск: Беларусь, 1985. – 32 с.


# *Інфармацыйны рэсурс*


1. http://dokshitsy.vitebsk-region.gov.by/ru/
2. https://ru.wikipedia.org/wiki/%C4%EE%EA%F8%E8%F6%EA%E8%E9_%F0%E0%E9%EE%ED
3. http://www.radzima.org/ru/photos_/dokshitskiy.html
4. http://www.radzima.net/ru/rayon/dokshycki.html
5. http://globus.tut.by/_regs/dokshic_tn.htm
6. http://westki.info/artykuly/11761/doksickiy-rayon-bielarus-doksicy-krulievshchina-biehoml-parafianovo-novosti-doksic